***Тэкст дыктанта***

***для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове***

***ў 10 клас Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча***

Беларускае кавальства

Сярод розных рамёстваў адно з самых пачэсных месцаў займае кавальства. Кавальскае рамяство патрабавала майстэрства, ведання тэхналагічных сакрэтаў апрацоўкі матэрыялу. Умение выплавіць руду, вызначыць патрэбны працэнт дабавак, тэмпературу нагрэву, ступень загартоўкі лічылася амаль чараўніцтвам. Недарэмна праца каваля з'яўлялася адной з самых паважаных. Кавальства ў свой час адносілася да ліку рамёстваў спадчынных.

Без уласнага майстра-каваля не абыходзілася ніводнае паселішча. Калі трэба было падкаваць каня, назубіць серп, выкаваць завесу, ішлі да каваля. Добрага майстра ведала ўся акруга. Ім ганарыліся, яго шанавалі. Кавальскае рамяство было акружана арэолам таямнічасці, загадкавасці. Каваля параўноўвалі з чараўніком, які валодае цудадзейнымі сакрэтамі апрацоўкі жалеза.

З першага погляду кавальскія вырабы не ўражваюць ярка выяўленымі мастацкімі якасцямі, якія характэрны для тканых, вышываных, разьбяных. Але пільнае вока сярод мноства каваных рэчаў знойдзе нямала цікавага і арыгінальнага. У розных кутках Беларусі можна сустрэць нямала цудоўных узораў кавальскага майстэрства: вароты, агароджы, рашоткі. Такія вырабы нагадваюць далікатныя карункі. ***(145 слоў).***

*Паводле Я. Сахуты*